УДК 930(476)"1944/1961"

# Развіццё беларускай гістарычнай навукі (1944–1961)

**Матораў С.А.**
*Установа адукацыі*
*"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава",*
*Віцебск*

*Гістарычная навука па праву займае адно з вядучых месцаў у сістэме гуманітарных ведаў. Аб'ектыўны і непрадузяты аналіз гістарычнага мінулага шмат у чым вызначае парадыгму паспяховага руху грамадства па шляху прагрэсу ў будучыні.*

*Толькі на пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя беларуская гістарычная навука сфарміравалася ў якасці самастойнай галіны гістарычных ведаў, паколькі вызначыліся аб'ектыўныя асновы яе функцыянавання. У прыватнасці, узнікае нацыянальная гісторыя (гісторыя БССР), а таксама з'явіліся значныя навуковыя даследаванні па розных раздзелах сусветнай гісторыі і гісторыі СССР. Тым не менш эфектыўнасць і якасць навукова-даследчай работы калектываў Інстытута гісторыі АН БССР і гістарычных кафедраў беларускіх ВНУ заставаліся, як і раней, параўнальна невысокімі. Друкуецца значная колькасць навуковых публікацый, але ў асноўнай сваёй масе яны былі звязаны з грамадска-палітычнай тэматыкай, раскрывалі розныя аспекты дзейнасці КПСС і КПБ.*

*Мэтай дадзенай працы з'яўляецца крытычнае асэнсаванне ролі і месца беларускай гістарычнай навукі ў адзін з самых складаных і неадназначных перыядаў духоўнага жыцця беларускага грамадства – перыяд 40-х–50-х гг. XX стагоддзя.*

***Матэрыял і метады.** У якасці крыніц даследавання былі выкарыстаны дакументальныя матэрыялы фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, інструкцыі, пастановы, цыркулярныя лісты органаў кіравання, матэрыялы гістарычных даследаванняў і перыядычнага друку. Метадалагічная аснова даследавання – прынцыпы аб'ектыўнасці і гістарызму. У працы прымяняліся агульнанавуковыя метады аналізу і сінтэзу, індукцыі і дэдукцыі, а таксама спецыяльна-гістарычныя: гісторыка-сістэмны, параўнальна-супастаўляльны, рэтраспектыўны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** У другой палове 40-х – пачатку 50-х гадоў рэальная навукова-даследчая праца калектываў Інстытута гісторыі АН БССР і гістарычных кафедраў беларускіх ВНУ, выключаючы адзінкавыя выпадкі, практычна не праводзілася. Гэта было звязана з тым, што, па-першае, працэс аднаўлення вышэйшай школы Беларусі яшчэ канчаткова не завяршыўся, а па-другое, тое, што ідэалагічная машына сталінскага таталітарнага рэжыму цалкам вызначала, якім крытэрыям павінны адпавядаць гуманітарныя веды наогул і гістарычная навука ў прыватнасці. Навукоўцы-гісторыкі не мелі права на ўласны творчы пошук, праявы арыгінальнасці, і тым больш, на крытычнае стаўленне да савецкай рэчаіснасці.*

*Да пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя беларуская гістарычная навука канчаткова вылучаецца ў якасці самастойнай галіны гістарычных ведаў, паколькі былі пабудаваны аб'ектыўныя асновы яе функцыянавання. Так, з'явілася нацыянальная гісторыя (гісторыя БССР), а таксама былі праведзены значныя навуковыя даследаванні па розных раздзелах сусветнай гісторыі і гісторыі СССР. Аднак эфектыўнасць і якасць навукова-даследчай працы калектываў Інстытута гісторыі АН БССР і гістарычных кафедраў беларускіх ВНУ былі невысокімі.*

***Заключэнне.** Характарызуючы ўзровень развіцця беларускай гістарычнай навукі ў 1944–1961 гг., неабходна канстатаваць наступнае. У другой палове 40-х – пачатку 50-х гадоў XX ст. рэальная навукова-даследчая праца калектываў Інстытута гісторыі АН БССР і гістарычных кафедраў беларускіх ВНУ, выключаючы адзінкавыя выпадкі, практычна не праводзілася.*

*З сярэдзіны 50-х гадоў XX стагоддзя становішча стала змяняцца. Навукова-даследчая праца калектываў беларускіх гісторыкаў атрымлівае пэўнае развіццё. Дзякуючы іх намаганням у пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя ў беларускай гістарычнай навуцы канчаткова сфарміравалася ўласная метадалагічная і змястоўная база для правядзення навуковых даследаванняў. Тым не менш іх якасны ўзровень па-ранейшаму заставаўся недастаткова высокім. На гістарычную навуку ўскладалася, па сутнасці, адзіная функцыя – ідэалагічнае забеспячэнне рэалізацыі пастулатаў і рашэнняў партыйна-палітычнай эліты савецкага грамадства.*

***Ключавыя словы:** гістарычная навука, гістарычныя даследаванні, ідэалагічныя фактары, метадалогія гістарычнай навукі, навукова-даследчая дзейнасць беларускіх гісторыкаў, партыйнае кіраўніцтва гістарычнай навукай.*

*(Ученые записки. – 2021. – Том 33. – С. 22–27)*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: vsu.fsp@mail.ru*** *– С.А. Матораў*

# Development of Belarusian History Science (1944–1961)

***Matorau S.A.***
*Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*History science takes one of the leading places in the system of humanitarian knowledge. An objective and unbiased analysis of the historical past indicates the paradigm of the successful movement of the society along the way of progress.*

*Only in the early 60s of the 20th century Belarusian history science shaped itself as an independent branch of historical knowledge due to the establishment of objective bases for it. Namely, national history emerges (history of the BSSR), considerable research of different sections of world history and history of the USSR also appeared. At the same time, the efficiency and quality of the scientific research work of the Institute of History of the BSSR Academy of Sciences and History Departments of Belarusian un8versitiesremained, as before, rather low. A great number of scientific works were published but they mainly referred social and political topics, revealed various aspects of the Communist party of the USSR and the Communist Party of Belarus activities.*

*The purpose of the work is critical interpretation of the role and the place of Belarusian history science during one of the most difficult periods of Belarusian society spiritual life, the 1940s – 1950s of the 20th century*

***Material and methods.** As the research sources documental materials from funds of the National Archive of the Republic of Belarus, guidelines, decrees by administration bodies, historic research materials and periodicals were used. The research methodological basis was principles of objectivity and historicism. General scientific methods of analysis and synthesis, induction and deduction as well as special historical methods, the historical and system, comparative, retrospective methods were used.*

***Findings and their discussion.** In the late 40s – early 59s, except several cases, there wasn't any real research by Institute of History of the Academy of Sciences of the BSSR or by university History Departments. It was due to the fact that, first of all, the process of Belarusian higher school revival had not finished, and, secondly, that Stalin's totalitarian regime ideological vehicle determined all the criteria for humanitarian sciences in general and history science in particular. History scientists did not have the right for their own creative search, specificity, to say nothing about critical attitude to Soviet reality.*

*By the early 1960s Belarusian history science had finally shaped itself as an independent branch of historical knowledge since objective bases for it were built. Namely, the national history (History of the BSSR) emerged; considerable researches were conducted as well on various sections of World History and History of the USSR. However, the efficiency and quality of the scientific research by Institute of History of the Academy of Sciences of the BSSR and History Departments at universities remained low.*

***Conclusion.** To characterize the level of the development of Belarusian history science in 1944–1961, it is necessary to state the following. In the late 40s – early 50s of the 20th century the real scientific research work by Institute of History of the Academy of Sciences of the BSSR and university History Departments, but for several cases, was not conducted.*

*Since the mid - 1950s the situation changed. The scientific research by Belarusian history scientists significantly developed. Due to their efforts the independent methodological and content research base finally shaped itself in the early 1960s in Belarusian history science. At the same time, its quality still remained rather low. In reality, history science was given one function, the function of ideological provision for the implementation of the Soviet state Party elite decisions.*

***Key words:** history science, historic research, ideological factors, methodology of history science, scientific research by Belarusian history scientists, Party management of history science.*

*(Scientific notes. – 2021. – Vol. 33. – P. 22–27)*

Гістарычная навука па праву займае адно з вядучых месцаў у сістэме гуманітарных ведаў. Аб'ектыўны і непрадузяты аналіз гістарычнага мінулага шмат у чым вызначае парадыгму паспяховага руху грамадства па шляху прагрэсу ў будучыні. Да пачатку 60-х гадоў ХХ стагоддзя беларуская гістарычная навука канчаткова сфарміравалася ў якасці самастойнай галіны гістарычных ведаў, паколькі вызначыліся аб'ектыўныя асновы яе функцыянавання. У прыватнасці, узнікае нацыянальная гісторыя (гісторыя БССР), а таксама з'явіліся значныя навуковыя даследаванні па розных раздзелах сусветнай гісторыі і гісторыі СССР. Тым не менш эфектыўнасць і якасць навукова-даследчай работы калектываў Інстытута гісторыі АН БССР і гістарычных кафедраў беларускіх ВНУ заставаліся, як і раней, параўнальна невысокімі. Друкуецца значная колькасць навуковых публікацый, але ў асноўнай сваёй масе яны былі звязаны з грамадска-палітычнай тэматыкай, раскрывалі розныя аспекты дзейнасці КПСС і КПБ. Падобная ідэалагічная заангажаванасць дэвальвавала само паняцце прадмета навуковага даследавання ў сферы гісторыі і прадвызначала ў будучыні тэндэнцыю атрымання толькі такіх вынікаў навукова-даследчай дзейнасці, якія цалкам адпавядалі афіцыйнай ідэалогіі, што абслугоўвала дзяржаўна-палітычную сістэму.

Мэтай дадзенай працы з'яўляецца крытычнае асэнсаванне ролі і месца беларускай гістарычнай навукі ў адзін з самых складаных і неадназначных перыядаў духоўнага жыцця беларускага грамадства – перыяд 40–50-х гг. ХХ стагоддзя.

**Матэрыял і метады.** У якасці крыніц даследавання былі выкарыстаны дакументальныя матэрыялы фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь,

інструкцыі, пастановы, цыркулярныя лісты органаў кіравання, матэрыялы гістарычных даследаванняў і перыядычнага друку.

Метадалагічная аснова даследавання – прынцыпы аб’ектыўнасці і гістарызму. У працы прымяняліся агульнанавуковыя метады аналізу і сінтэзу, індукцыі і дэдукцыі, а таксама спецыяльна-гістарычныя: гісторыка-сістэмны, параўнальна-супастаўляльны, рэтраспектыўны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Змест і якасць навукова-даследчай працы беларускіх гісторыкаў вызначаліся ўплывам ідэалагічнага фактару. Ідэалогія сталінізму, якая непадзельна панавала ў савецкім грамадстве ў 40-я і на пачатку 50-х гадоў XX ст., непрымірыма ставілася да самастойнасці навукоўцаў, да іх творчых пошукаў, праяў арыгінальнасці і тым больш, да элементаў крытычнага стаўлення да савецкай рэчаіснасці. Сталінскі рэжым манапалізаваў права па сваім меркаванні накіроўваць творчасць навуковай інтэлігенцыі, свядома ўкараняў у яе асяроддзі казарменную аднастайнасць, канфармізм, прыстасаванства і, у канчатковым выніку, шэрасць і пасрэднасць. Усё гэта вяло не да росквіту навукі, як сцвярджала афіцыйная прапаганда, але, наадварот, спрыяла яе дэградацыі. У адносінах да гуманітарных навук ідэалагічны апарат увогуле ўсклаў на сябе функцыю да драбнюткіх дэталяў вызначаць не толькі што, але і якім чынам вывучаць. Так, у апублікаваных у 1948 годзе «Тезисах об основных вопросах истории БССР» (частка 1) галоўнымі задачамі беларускай гістарычнай навукі было прапанавана лічыць абвяржэнне тэорыі існавання так званага “залатога стагоддзя” (перыяду найвышэйшага сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, культурнага росквіту) Беларусі ў XIV–XVI стагоддзях і тэзіса аб тым, што «...будто бы свет культуры в Белоруссию всегда шёл не с востока, не из России, а только с запада, …через литовское и польское государства, через римско-католическую церковь». Беларускіх гісторыкаў адкрыта абвінавацілі ў тым, што гэтыя погляды яны запазычылі ад «...белорусских и польских националистов, которые всегда идеализировали патриархальную и феодальную Белоруссию, вопили о “бесклассовости” белорусского народа и самобытности путей его развития, выдвигали лозунг возрождения “Кривской державы”, коей в действительности не было в истории». Жорсткай крытыцы былі падвергнуты атрымаўшыя распаўсюджанне ў беларускай гістарычнай навуцы погляды і меркаванні па прыватных праблемах беларускай гісторыі: *па-першае*, што развіццё ў IX–X стагоддзях славянскіх плямёнаў, якія рассяліліся на тэрыторыі Беларусі, адбывалася ізалявана ў адрыве ад іншых усходніх славян; *па-другое*, што Польская дзяржава з’яўлялася дзяржавай і беларускага народа; *па-трэцяе*, што Беларусь нібыта прыйшла ў заняпад пасля ўваходжання ў склад Расіі ў канцы XVIII стагоддзя; *па-чацвёртае*, што з канца XIX стагоддзя беларускі народ быццам бы актыўна змагаўся не за знішчэнне сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту з боку царызму, памешчыкаў і капіталістаў, а за “адраджэньне Крыўскай дзяржавы”. Перад беларускімі гісторыкамі таксама была пастаўлена задача аб поўнай адмове ад меркавання, што княствы Заходняй Русі нібыта добраахвотна аб’ядналіся з літоўскай дзяржавай у рамках Вялікага Княства Літоўскага ў XIII–XIV стагоддзях, паколькі Літва выступіла іх надзейным абаронцам ад мангола-татарскага нашэсця. Адпаведна, не магло быць і гаворкі пра тое, што беларускі народ нібыта карыстаўся нейкай “шырокай аўтаноміяй” ў Вялікім Княстве Літоўскім. Беларускім гісторыкам прапаноўвалася асаблівую ўвагу звярнуць на праблему “правільнай”, “аб’ектыўнай” трактоўкі шляхоў развіцця беларускай матэрыяльнай і духоўнай культуры ў XIV–XVII стагоддзях, на ролю канкрэтных дзяржаўных, палітычных, ваенных, культурных дзеячаў у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў гэты перыяд часу. У прыватнасці, рэкамендавалася цалкам выключыць з гістарычнай літаратуры сцвярджэнні, што стварэнне Віленскай акадэміі езуітаў, заснаванай Стэфанам Баторыем і Рымскім Папам, паклала пачатак вышэйшай адукацыі ў Беларусі; што Канстанцін Астрожскі быў славутым сынам беларускага народа, а не рэакцыянерам, «…который известен только тем, что всякими вероломными средствами вёл борьбу против Московского государства в союзе с татарами и ливонцами». Дзейнасць жа Мялеція Сматрыцкага прапаноўвалася характарызаваць не ў плане яго значнага ўкладу ў развіццё духоўнай культуры і асветы беларускага народа ў XVII стагоддзі, а ў якасці яго дзеянняў як «наёмного иезуитского агента». Такія «извращения националистического порядка», якія рабілі беларускія гісторыкі ў асвятленні беларускай гісторыі, на думку ідэалагічнага апарата сталінскага рэжыму, былі абумоўлены адсутнасцю неабходнага “класавага падыходу” да ацэнкі падзей мінулага [1].

Падобныя метадалагічныя ўстаноўкі ў галіне гістарычных даследаванняў спрыялі стварэнню абмежаваных рамак навуковага пошуку, адыход ад якіх пагражаў найцяжкім абвінавачваннем у “нацыяналізме”. Таму прадстаўнікі беларускай гістарычнай навукі павінны былі прытрымлівацца канфарміcцкай пазіцыі і адыходзіць ад прынцыпу бесстароннасці, аб’ектыўнасці ў асвятленні падзей мінулага. Ва ўмовах навязанага таталітарным рэжымам падменай тлумачэння паняццяў “нацыянальная” і “нацыяналістычнае”, няслушнага разумення і змешвання пачуцця нацыянальнай самасвядомасці з сапраўднымі праявамі нацыяналістычных поглядаў і тэорый, што было прамым працягам палітыкі 30-х гадоў XX ст., пастаноўка пытанняў аб неабходнасці вывучэнні праблем нацыянальнай гісторыі, нацыянальнай культуры, мовы ацэньвалася як праява нацыяналізму.

На пачатку 50-х гадоў XX ст. ідэалагічны апарат партыйных органаў вызначыў галоўны кірунак навукова-даследчай дзейнасці беларускіх гісторыкаў – падрыхтоўка і выданне ў самыя кароткія тэрміны комплекснай, фундаментальнай працы па беларускай

гісторыі ў двух тамах. Прычым выкарыстоўваць гэтае выданне меркавалася і ў якасці асноўнага навучальнага дапаможніка для студэнтаў беларускіх ВНУ па ўсёй праблематыцы беларускай гісторыі. У склад яго аўтарскага калектыву ўвайшлі вядомыя беларускія гісторыкі, якія працавалі ў Інстытуце гісторыі АН БССР (В.М. Перцаў, Н.М. Нікольскі), Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ (М.Е. Шкляр), выкладчыкі ВНУ (Л.С. Абэцэдарскі, А.П. Скуман – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; А.П. П'янкоў – Мінскі педінстытут і інш.), і партыйныя работнікі з апарата ЦК КПБ, якія працавалі ў ідэалагічнай сферы (К.І. Шабуня). Выхаду першага тома "Гісторыя БССР" ў 1954 годзе папярэднічала правядзенне некалькіх спецыяльных навуковых канферэнцый і дыскусій, у якіх прынялі ўдзел не толькі беларускія, але і шэраг вядомых гісторыкаў з Масквы, Украіны, Латвіі і Літвы [2]. Нягледзячы на тое, што структура першага тома "Гісторыя БССР", які асвятляў праблемы беларускай гісторыі з старажытных часоў па 1917 год, адбор і падача матэрыялу, высновы і ацэнкі аўтараў вызначаліся ў значнай меры з пазіцый сталінскай гістарычнай метадалогіі. Тым не менш гэта выданне і ў навуковым плане, і ў якасці навучальнага дапаможніка мела шэраг бясспрэчных вартасцяў. Самым галоўным з іх было імкненне аўтараў прытрымлівацца прынцыпу гістарызму ў выкладзе беларускай гісторыі. Палеміка, што разгарнулася ўнутры аўтарскага калектыву па інтэрпрэтацыі гістарычнага матэрыялу, які быў змешчаны ў першым томе "Гісторыя БССР", лепш за ўсё ілюструе атмасферу ў духоўным жыцці, у ідэалагічнай сферы нашага грамадства пачатку 50-х гадоў XX ст. Так, дырэктар Інстытута гісторыі АН БССР Н.М. Нікольскі, які з'яўляўся рэдактарам першага тома "Гісторыі БССР", адкрыта абвінаваціў членаў рэдкалегіі Л.С. Абэцэдарскага, В.М. Перцава, К.І. Шабуню не больш і не менш, як у "адкрытай" рэвізіі марксісцка-ленінска-сталінскай гістарычнай метадалогіі. У прыватнасці, ён асабліва акцэнтаваў увагу на тым, што любая трактоўка беларускай гісторыі павінна грунтавацца «... прежде всего на подлинных высказываниях Маркса, Энгельса, Ленина и Сталина, а не на указаниях, хотя бы и руководящих различных правительственных органов и их вспомогательных учреждений, в данном случае имеющих 15-летнюю давность. Это само собой разумеющееся простое положение многими товарищами из коллективов АН БССР и, особенно, БГУ следовало помнить теперь, после известных весьма показательных фактов 1949 и 1950 годов». Сваіх навуковых апанентаў Н.М. Нікольскі адкрыта залічыў у шэрагі прыхільнікаў «антимарксистского, антинаучного, вреднейшего "нового учения о языке Марра", "учения", которое в течение двух десятилетий отравляло своим ядом советскую науку, включая и историческую». Не саромеючыся ў выразах і цалкам скажаючы бясспрэчныя гістарычныя факты па праблемах перыядызацыі старажытнай беларускай гісторыі, прагрэсіўнага характару прыняцця праваслаўнага хрысціянства на беларускіх землях, ролі праваслаўя ў наступнай беларускай гісторыі акадэмік Н.М. Нікольскі называў, у прыватнасці, погляды Л.С. Абэцэдарскага па гэтых пытаннях няйначай, як «буржуазно-богословскими», «издевательством над учением Маркса, Энгельса, Ленина, Сталина о сущности и роли религии». Сваю ж пазіцыю Н.М. Нікольскі імкнуўся абгрунтаваць сцвярджэннямі, якія не адпавядалі прынцыпам сапраўды гістарычнай метадалогіі, але ў той жа час добра ўпісваліся ў схему існаваўшых тады гістарычных канструкцый. Так, разважаючы пра ролю праваслаўнага хрысціянства ў беларускай гісторыі, ён настойваў, што ў Беларусі у XVI–XVII стагоддзях існавала «особенно зверская эксплуатация крестьян православными феодалами» і, што, наогул, казаць аб прагрэсіўным характары хрысціянства, у тым ліку і праваслаўнага, это – «…всё равно, что, например, утверждать будто бы философия Канта или какая-либо другая идеалистическая философия XVIII–XIX веков была "прогрессивнее" философии Платона – ибо эти философии были одинаково идеалистическими и, следовательно, антинаучными и реакционными» [3] .

У канцы 40-х – пачатку 50-х гадоў пытанні арганізацыі і правядзення навукова-даследчай работы ў сферы гуманітарных навук пастаянна разглядаліся партыйнымі органамі Беларусі на самым высокім узроўні. Так, у 1949 годзе была праведзена шырокамасштабная праверка навуковай дзейнасці педагагічных інстытутаў з абмеркаваннем яе вынікаў на ўзроўні аддзелаў ЦК КПБ. У лютым 1951 года ЦК КПБ прыняў пастанову "Аб рабоце МДПІ ім. А.М. Горкага", а ў чэрвені 1952 года – "Аб рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта". У іх асабліва акцэнтавалася ўвага на недахопах, характэрных для навукова-даследчай дзейнасці кафедраў грамадскіх, гуманітарных і гістарычных навук Мінскага дзяржаўнага педінстытута і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта: слабы ўдзел асноўнай масы выкладчыкаў кафедраў у навуковай рабоце; невыкананне з году ў год многіх тэм навуковых даследаванняў; адсутнасць належнага кантролю за зместам навукова-даследчай дзейнасці выкладчыкаў [4]. Такі дырэктыўны стыль кіраўніцтва навукова-даследчай дзейнасцю ў сферы гуманітарных навук меў сваім вынікам з'яўленне велізарнай колькасці псеўданавуковых работ. Іх адзінай мэтай была безумоўная апалагетыка сталінскага рэжыму, яго ўнутранай і знешняй палітыкі. З 1953 года, у сувязі са значнымі зменамі, якія адбываліся ў ідэалагічным, духоўным жыцці савецкага грамадства, шмат у чым сталі іншымі формы і змест навукова-даследчай дзейнасці беларускіх гісторыкаў. У яе аснове з'явіліся элементы творчасці, вольнага навуковага пошуку і імкненне прытрымлівацца крытэрыяў аб'ектыўнасці ў працэсе даследавання. Але ў той жа час ідэалагічны апарат партыйных органаў Беларусі па-ранейшаму вызначаў прыярытэты ў галіне гістарычных навуковых даследаванняў, жорстка рэгламентаваў і кантраляваў іх ход шляхам увядзення новых дадатковых працэдур бюракратычнага характару.

Усе недахопы навукова-даследчай дзейнасці беларускіх гісторыкаў (выпадковы выбар, дубляванне тэм даследаванняў і кандыдацкіх дысертацый, планаванне для выканання ўжо распрацаваных тэм) сталі звязваца толькі з адсутнасцю належнай ступені яе каардынацыі. Таму, у маі 1954 года, у сакавіку 1957 і чэрвені 1960 гадоў былі праведзены ўсебеларускія каардынацыйныя нарады гісторыкаў, у якіх прынялі ўдзел навуковыя супрацоўнікі інстытутаў гісторыі АН БССР і гісторыі партыі пры ЦК КПБ, загадчыкі кафедраў гісторыі КПСС і гістарычных кафедраў розных беларускіх ВНУ. Аднак правядзенне ў наступным рэгулярных каардынацыйных нарад беларускіх гісторыкаў і стварэнне каардынацыйных саветаў па арганізацыі і правядзенні навуковых даследаванняў у структурах інстытута гісторыі АН БССР, гісторыі партыі пры ЦК КПБ не аказалі значнага станоўчага ўздзеяння на паляпшэнне якасці навукова-даследчай дзейнасці беларускіх гісторыкаў у 50-я – пачатку 60-х гадоў XX ст. У само паняцце “каардынацыя” ўкладваўся іншы сэнс, сутнасць якога заключалася ў дазволе займацца навукова-даследчай дзейнасцю па вызначанай праблематыцы, а не ў стварэнні аптымальных умоў для свабоднага і творчага навуковага пошуку. У 50-я гады XX ст. сярод усіх беларускіх ВНУ вядучыя пазіцыі ў арганізацыі і правядзенні навукова-даследчай дзейнасці займалі калектывы кафедраў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Да пачатку 60-х гадоў XX ст. імі было выдадзена вялікая колькасць індывідуальных і калектыўных манаграфій, навучальных дапаможнікаў, навуковых артыкулаў па рознай праблематыцы гісторыі СССР і БССР, сусветнай гісторыі, археалогіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. Шмат у чым дзякуючы выхаду гэтых навуковых даследаванняў такія галіны гістарычнай навукі ў Беларусі, як айчынная гісторыя (гісторыя БССР), гісторыя старажытнага свету, гісторыя новага і найноўшага часу, археалогія, завяршылі перыяд свайго станаўлення і атрымалі перадумовы для свайго наступнага развіцця. Так, на кафедрах гісторыі СССР і БССР, цалкам укамплектаваных выкладчыкамі, якія закончылі БДУ і аспірантуру пры кафедрах гістарычнага факультэта БДУ, глыбока вывучаліся праблемы гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі; сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР; сацыяльна-класавай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы насельніцтва Заходняй Беларусі ў 1918–1939 гг.; аграрнай рэформы 1861 года і звязанага з ёй развіццём рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху ў Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя; гісторыі беларускіх феадальных гарадоў; руска-беларускіх гандлёвых і культурных сувязеў XVI–XVII стагоддзяў; барацьбы беларускага народа за аб’яднанне з Расіяй у другой палове XVII стагоддзя. Выкладчыкі кафедраў гісторыі СССР і БССР правялі значную работу па падрыхтоўцы школьных і ўніверсітэцкіх праграм па гісторыі БССР як самастойнай гістарычнай дысцыпліны, якая вывучаецца ў сярэдняй школе і ВНУ. Імі таксама было апублікавана вялікая колькасць метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў і вучняў сярэдняй школы па беларускай гісторыі. У 1960 годзе Л.С. Абэцэдарскі, М.П. Баранава, Н.Г. Паўлава выдалі першы ў рэспубліцы вучэбны дапаможнік для сярэдняй школы па нацыянальнай гісторыі Беларусі – “Гісторыя БССР” [5]. Калектыў кафедры гісторыі новага і найноўшага часу гістфаку БДУ засяродзіў сваю навуковую дзейнасць на вывучэнні праблем гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі асобных еўрапейскіх краін у другой палове XIX – першай чвэрці XX стагоддзя. На кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў вядучым напрамкам навуковай дзейнасці з’яўлялася распрацоўка шэрагу важных пытанняў канцэптуальнага характару, звязаных з гісторыяй раннерабаўладальніцкіх дзяржаў Старажытнага Усходу і антычнага свету. Так, у 1959 годзе, былі выдадзеныя дзве манаграфіі Г.М. Ліўшыца: «Классовая борьба в Иудеи и восстания против Рима» і «Кумранские рукописи и их историческое значение». У 1960 годзе была апублікаваная яшчэ адна яго манаграфія «Социально-политическая борьба в Риме в 60-е годы I века до н.э. и заговор Катилины» [6].

У той жа час аналіз навуковай дзейнасці калектываў кафедраў гістарычнага факультэта БДУ паказаў, што яна шмат у чым, як і ў 40-я – пачатку 50-х гадоў, вызначалася не ўласна навуковымі, а палітычна заказнымі, ідэалагічнымі меркаваннямі. Так, сярод усіх гістарычных кафедраў БДУ вядучай лічылася навукова-даследчая дзейнасць кафедры гісторыі КПСС. Выкладчыкі кафедры, якія прынялі ўдзел у калектыўнай, “комплекснай” распрацоўцы трох тэм навукова-даследчай працы: «Деятельность КПБ по осуществлению в БССР комплексного плана построения социализма», «Героическая борьба трудящихся Западной Белоруссии за своё социальное и национальное освобождение», «История комсомола Белоруссии в период зарубежной интервенции и гражданской войны», былі вызваленыя ад правядзення вучэбных заняткаў на 3–4 месяцы і працавалі толькі над гэтымі планавымі тэмамі [7]. Яшчэ ў больш гіпертрафаваным выглядзе падобны падыход да арганізацыі навукова-даследчай работы калектываў гістарычных кафедраў ажыццяўляўся ў рэгіянальных ВНУ. Асноўнай задачай, якая была пастаўлена перад імі ў галіне навуковых даследаванняў, з’яўлялася не столькі вывучэнне розных гістарычных праблем з выкарыстаннем мясцовага матэрыялу, колькі апісанне сацыяльна-палітычнай сітуацыі, якая існавала ў іх рэгіёне ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў і якая пазначалася ідэалагічным штампам “рэвалюцыйны рух”; ходу рэвалюцыйных падзей у 1917 годзе і ўсталявання Савецкай улады на месцах; апалагетыка поспехаў у сацыяльна-эканамічным развіцці, дасягнутых за гады Савецкай улады. Так, кафедры гісторыі КПСС і гісторыі СССР Магілёўскага педагагічнага інстытута з прыцягненнем выкладчыкаў іншых кафедраў павінны былі распрацоўваць “комплексную” калектыўную

тэму па гісторыі г. Магілёва за гады Савецкай улады. Акрамя гэтага, супрацоўнікі кафедры гісторыі СССР Магілёўскага педінстытута працавалі над праблемамі сялянскага руху ў Беларусі пасля адмены прыгоннага права і калгаснага будаўніцтва ў 1917–1936 гг. Падобным чынам праводзілася навукова-даследчая праца на кафедрах гісторыі КПСС і гісторыі СССР Гродзенскага і Гомельскага педагагічных інстытутаў па вывучэнні гісторыі г. Гродна і Гродзенскай вобласці, г. Гомеля і Гомельскай вобласці [8]. Такі падыход да арганізацыі і правядзення навукова-даследчай работы калектывамі гістарычных кафедраў ствараў ілюзію вонкавага яе дабрабыту і дасягнутых поспехаў. Да пачатку 60-х гадоў былі выдадзеныя дзясяткі манаграфій і брашур, апублікаваныя сотні даследчых артыкулаў, якія па фармальных прыкметах варта лічыць даследаваннямі ў галіне гістарычнай навукі. Аднак навуковая каштоўнасць абсалютнай большасці з іх была нязначнай, паколькі яны былі напісаныя па гісторыка-партыйнай тэматыцы і ахоплівалі да таго ж вельмі вузкі, з пункту гледжання навуковай гістарычнай метадалогіі, храналагічны адрэзак часу – з канца ХІХ стагоддзя па 50-я гады ХХ стагоддзя . Нізкая навуковая каштоўнасць навуковых прац па гісторыка-партыйнай тэматыцы была абумоўленая тым, што, па-першае, існаваў пастаянны, ідэалагічны заказ з боку партыйных органаў на падобную навуковую прадукцыю, а, па-другое, што ўсе яны грунтаваліся на такіх архіўных матэрыялах і іншых відах гістарычных крыніц, ступень навуковай дакладнасці якіх была вельмі ўмоўнай.

Характэрнай рысай навукова-даследчай дзейнасці калектываў гістарычных кафедраў беларускіх ВНУ ў пачатку 60-х гадоў ХХ ст. з’яўлялася і тая акалічнасць, што напісанне выкладчыкамі кафедраў дысертацый лічылася галоўным крытэрыем эфектыўнасці навуковай працы ўсяго кафедральнага калектыву.

**Заключэнне.** Характарызуючы ўзровень развіцця беларускай гістарычнай навукі ў 1944–1961 гг., неабходна канстатаваць наступнае. У другой палове 40-х – пачатку 50-х гадоў ХХ ст. рэальная навукова-даследчая праца калектываў Інстытута гісторыі АН БССР і гістарычных кафедраў беларускіх ВНУ, выключаючы адзінкавыя выпадкі, практычна не праводзілася. Гэта было звязана з тым, што, *па-першае*, працэс аднаўлення вышэйшай школы Беларусі яшчэ канчаткова не завяршыўся, а *па-другое*, тое, што ідэалагічная машына сталінскага таталітарнага рэжыму цалкам вызначала і кантралявала тыя крытэрыі, якім павінны адпавядаць гуманітарныя веды ўвогуле і гістарычная навука ў прыватнасці. Тым самым навукова-даследчая дзейнасць у галіне гістарычнай навукі была пазбаўленая самага галоўнага – свабоды творчасці. З сярэдзіны 50-х гадоў ХХ стагоддзя становішча стала змяняцца. Навукова-даследчая праца калектываў беларускіх гісторыкаў атрымлівае пэўнае развіццё. Дзякуючы іх намаганням у пачатку 60-х гадоў ХХ стагоддзя ў беларускай гістарычнай навуцы канчаткова сфарміравалася ўласная метадалагічная і змястоўная база для правядзення навуковых даследаванняў. Тым не менш іх якасны ўзровень па-ранейшаму заставаўся недастаткова высокім. Асноўная прычына такога становішча мела штучны характар і была абумоўлена рэаліямі сацыяльна-палітычнага становішча і духоўна-маральнай, ідэалагічнай атмасферы савецкага грамадства пачатку 60-х гадоў ХХ стагоддзя. На гістарычную навуку ўскладалася, па сутнасці, адзіная функцыя – ідэалагічнае забеспячэнне рэалізацыі пастулатаў і рашэнняў партыйна-палітычнай эліты савецкага грамадства.

## Літаратура


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ) – Ф. 4. Оп. 73. Д. 53. Л. 12, 136; Д. 146. Л. 246, 249–250.
2. НАРБ. – Ф. 4. Оп. 73. д. 8. Л. 24–25; Д. 76. Л. 21.
3. НАРБ. – Ф. 4. Оп. 73. Д. 32. Л. 5, 22; Д. 53. Л. 156, 159, 161, 163–164. 4.
4. НАРБ. – Ф. 42. Оп. 4. Д. 348. Л. 73–74; Ф. 205. Оп. 5. Д. 347. Л. 85–86.
5. Храпко, Л.П. Развитие исторической науки в БССР (1945 г.г. – конец 50-х годов): дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Л.П. Храпко. – Минск, 1989. – С. 33–34.
6. Савачкін, П.З. Развіццё навукі на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта / П.З. Савачкін // Вестн. Белорус. гос. ун-та имени В.И. Ленина. Сер. III. История. Философия. Экономика. Право. – 1969. – № 1. – С. 29.
7. НАРБ. – Ф. 205. Оп. 6. Д. 157. Л. 6.
8. Достижения исторической науки за 50 лет (1919–1969 гг.). Краткий очерк. – Минск: Наука и техника, 1970. – С. 68–69.


*Паступіў у рэдакцыю 02.03.2021*